4. *Ярецкая А. Ю*. Развивающая игра как средство интеллектуально воспитания старших дошкольников: автореф. дис. … канд. педагог. наук: 13.00.01 / Воронежский. гос. ун-т. Воронеж, 2016. 25 с.
5. *Жданова С. Н., Чиркова А. А.* Интерактивная игра как средство формирования созидательной позиции подростка: монография / Чебоксары: ИД «Среда», 2019. 76 с.
6. Российская педагогическая энциклопедия / Гл. ред. В. В. Давыдов. М.: Большая Рос. энцикл., 1993–1999. [Т.] 1: А–Л. 607, [1] с.

## МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ЎЛАДЫ І ПРЭСА: НА ШЛЯХУ ДА ПАРТНЁРСТВА

***А. І. Кунахавец-Плявака***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*elena_kunahovec@mail.ru*

Разглядаюцца асаблівасці рэдакцыйнай палітыкі раённых газет, у прыватнасці ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады. Даследаванне праводзілася на прыкладзе рэгіянальных выданняў Брэстчыны, заснавальнікамі якіх выступаюць мясцовыя выканаўчыя камітэты і мясцовыя Саветы дэпутатаў. Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады да адміністрацыйнага тандэма ўсё часцей далучаюцца і калектывы рэдакцый, органы ўлады па-ранейшаму аказваюць істотны ўплыў на інфармацыйную дзейнасць раённых газет.

***Ключавыя словы***: СМІ; раённыя выданні; інфармацыйная дзейнасць; рэдакцыйная палітыка; рэдакцыя; заснавальнік.

## LOCAL AUTHORITIES AND THE PRESS: ON THE WAY TO PARTNERSHIP

***A. I. Kunahavets-Plevako***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. I. Kunahavets-Plevako (elena_kunahovec@mail.ru)*

The author considers features of the editorial policy of district newspapers, in particular, interaction with local authorities are considered. The study was

conducted on the example of regional publications of the Brest region, founded by local executive committees and local councils of deputies. Despite the fact that in recent years the administrative tandem has been increasingly joined by editorial staffs, the authorities still have a great influence on the information activities of district newspapers.

***Key words:*** media; district newspapers; information activities; editorial policy; editorial office; founder.

Даследуючы функцыянаванне раённага друку, немагчыма абысцівачай пытанне ўзаемаадносін СМІ з мясцовымі ўладамі. Трэба аддаць належнае: у крызісныя 1990-я гады сістэма раённай перыёдыкі захавалася менавіта дзякуючы падтрымцы органаў улады. Сёння заснавальнікамі большасці раённых выданняў Брэстчыны па-ранейшаму застаюцца раённыя выканаўчыя камітэты і раённыя Саветы дэпутатаў (56,25 %). Заўважым, што ў апошнія гады да адміністрацыйнага тандэма далучыліся і калектывы рэдакцый (43,75 %). Гэта сведчыць аб тым, што статус мясцовых выданняў паступова змяняецца. Аднак, як паказвае практыка, нягледзячы на фармальнае раўнапраўе заснавальнікаў – калектываў рэдакцый і мясцовых адміністрацый, – органы ўлады маюць дастатковыя магчымасці для стымулявання працы СМІ.

Кантэнт-аналіз раённых газет Брэсцкай вобласці паказаў, што цэнтральнай тэмай выданняў застаецца асвятленне работы райвыканкамаў і мясцовых Саветаў дэпутатаў. Сярод дакументаў, на якія арыетуюцца журналісты ў сваёй рабоце, не толькі статут рэдакцыі, канцэпцыя выдання і яго бізнес-план, але і планы органаў мясцовай улады. Традыцыйна ў ролі асноўных ньюсмейкераў у рэгіёнах выступаюць чыноўнікі і дэпутаты. СМІ рэгулярна асвятляюць афіцыйныя мерапрыемствы, аднак здзіўляе, што інфармацыйнай падставай для напісання публікацый часта выступае звычайная актыўнасць мясцовых улад: на першы план выходзіць тое, што, напрыклад, старшыня райвыканкама наведаў прадпрыемства і азнаёміўся са спецыфікай работы калектыву. Журналісты абмяжоўваюцца паведамленнямі аб гэтам факце, не раскрываючы ні прычын, ні абставін, што, безумоўна, негатыўна адбіваецца на аўтарытэце «раёнак». Супрацоўнікі мясцовых выданняў нярэдка скардзяцца на тое, што кіраўнікі раёна не заўжды аператыўна прадстаўляюць неабходную інфармацыю па праблемных пытаннях, што сёння, у час імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій, выглядае зусім недарэчным. Атрымліваецца, што пакуль чыноўнікі «думаюць», у мясцовай суполцы нарастае ўзровень сацыяльнага напружання. Сваю ролю ў гэ-

тым плане адыгрываюць і неафіцыйныя інтэрнэт-рэсурсы, задача якіх у большай ступені падарваць давер чытачоў да афіцыйных СМІ.

Вызначаючы асаблівасці ўзаемадзеяння органаў мясцовай улады і прэсы, мэтазгодна звярнуцца да вынікаў апытання рэдактараў раённых газет Брэсцкай вобласці [1]. На пытанне пра ўзаемаадносіны са сваімі заснавальнікамі ў цэлым былі атрыманы даволі пазітыўныя адказы. Большасць кіраўнікоў СМІ гаворыць аб дзелавым супрацоўніцтве на правах і адсутнасці празмернага ўмяшання ў справы рэдакцыі з боку сваіх заснавальнікаў. Пры гэтым, характарызуючы тып узаемадзеяння газеты і мясцовых органаў улады, рэспандэнты часцей выкарыстоўвалі наступныя катэгорыі: «партнёрскія адносіны», «сацыяльнае партнёрства», «працоўныя адносіны», «канстуктыўны дыялог», акцэнтуючы ўвагу, што гэта менавіта дыялог, а не маналог. Вось некаторыя вытрымкі з адказаў апытаных: «супрацоўніцтва дзеля агульнай справы – інфармавання і рэальнай дапамогі ў вырашэнні праблем мясцовага насельніцтва», «мы – заснавальнікі, вы – выканаўцы», «газета паказвае работу ўлады, падтрымлівае давер да яе з боку насельніцтва», «канструктыўнае і плённае супрацоўніцтва ў межах прававога поля».

Адзначым, што 14,28 % рэдактараў для характарыстыкі тыпу ўзаемадзеяння са сваімі заснавальнікамі выкарысталі паняцце «кантроль». У ідэале кантрольную функцыю, якая ў першую чаргу заснавана на аўтарытэце грамадскай думкі, павінны выконваць менавіта сродкі масавай інфармацыі ў дачыненні да органаў улады, а ніяк не наадварот. Паказальна, што такая ж колькасць рэспандэнтаў увогуле пакінула гэтае пытанне без адказу. Значыць – у пэўных маштабах праблема ўсё ж такі існуе. Партнёрскія адносіны, як вядома, прадугледжваюць сумесную дзейнасць кіраўнікоў і падначаленых, выкананне загадзя абумоўленых абавязкаў, самастойнасць у прафесійнай дзейнасці, канкурэнтаздольнасць. І хоць адказваючы на пытанне: «Ці здольная раённая газета працягнуць сваю дзейнасць без адпаведнай падтрымкі?», усе рэдактары брэсцкіх СМІ адзначылі, што іх выданні фінансава незалежныя і самаакупныя (сапраўды, 16 раённых газет Брэстчыны сёння ў ліку рэнтабельных), аднак, як бачым, набыццё эканамічнай свабоды цалкам не змяніла сітуацыю. Прычыны рэальнага стылю ўзаемаадносін мясцовых органаў улады і прэсы, па меркаванні Л. М. Кіслай, хаваюцца ў спецыфіцы «сацыяльнай памяці» раённага друку. У нейкай ступені яна абавязвае журналістаў «змякчаць» крытыку ў адрас органаў улады ці нават пазбягаць такіх сітуацый [2, с. 101].

Сучасныя раённыя выданні нярэдка балансуюць паміж попытам з боку мясцовага насельніцтва і пазіцыяй заснавальніка, аднак трэба мець на ўвазе, што свабода СМІ і прафесійная незалежнасць журналістаў – базавая ўмова эфектыўнасці дэмакратычнай і сацыяльна адказнай прэсы. У той жа час даследчыкі адзначаюць, што «ў абодвух выпадках, і ў імкненні да максімальнай свабоды, і ў служэнні інтарэсам улады, усё адбіваецца на выкананні галоўнай задачы – служэнні грамадству… Аптымальны шлях для сродкаў масавай інфармацыі – прайсці паміж “Сцылай і Харыбдай” так, каб вытрымаць патрабаванні сацыяльнай місіі і адказнасці, не абмяжоўваючы свабоду творчасці і не трапляючы цалкам у “абдымкі” ўлады. Гэты падыход звязаны з пошукам залатой сярэдзіны паміж грамадствам і СМІ» [3, с. 273]. З такім меркаваннем нельга не пагадзіцца.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Кунаховец-Плевако Е. И*. Взаимодействие местных органов власти и прессы: диалог или монолог? // Материалы Междунар. молодежн. науч. форума «ЛОМОНОСОВ-2018» / Отв. ред. И. А. Алешковский, А. В. Андриянов, Е. А. Антипов [Электронный ресурс]. М.: МАКС Пресс, 2018. 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); 12 см. Систем. требования: ПК с процессором 486+; Windows 95; дисковод DVD-ROM; Adobe Acrobat Reader. 1450 Мб. 11000 экз.
2. *Кислая Л. Н*. Влияние местной власти на редакционную политику районной прессы // Известия Уральского государственного университета. Сер. 1, Проблемы образования, науки и культуры. 2008. № 60, вып. 24. С. 98–102.
3. *Ложко В. В., Яковлев И. П.* Социально-экономическая миссия региональных средств массовой информации // Проблемы современной экономики. 2013. 4 (48). С. 272–276.

## СТОРИТЕЛЛИНГ В БЕЛОРУССКОЙ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОЙ ПРЕССЕ

***А. Д. Маркович***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*markovAD@bsu.by*

Дается определение понятию «сторителлинг», рассматриваются его отличия от традиционных газетно-публицистических жанров журналистского текста. Сегодня данный инструмент может стать ключевым в формирова-